# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## АСІЛАК

Самаробная афіша паведамляла: «Анонс! Анонс! (што такое анонс, ніхто ў нас не ведаў). Асілак з асілкаў – барэц Патапаў: рукі і грудзі мацней каменя і жалеза! Не пераможаны на арэнах цыркаў свету! Жывы выходзіць з магілы. Спяшайцеся бачыць. Толькі два выступленні...»

Паглядзець на асілка местачкоўцы валілі валам. У нардоме забілі ўсе праходы, сядзелі на падлозе каля сцэны, на падаконніках, прымошчваліся хто дзе мог.

На сцэну выйшаў высачэзны, даўгатвары, з запалымі вачыма, худы, але з магутнаю крутою мускулатураю мужчына. Усмешка адкрыла вялікія жоўтыя зубы. Два пажарнікі ўнеслі нанізаныя на калок дзве трохпудовыя гіры. Патапаў іх падкідаў і лавіў, як гумавыя мячыкі. Потым скрутак шыннага жалеза наматаў сабе на руку, як бранзалет, выпраставаў і зноў згінаў падковы, ламаў напал жалезны прэнт.

Самы незвычайны быў апошні нумар. Усе выйшлі ў двор, запалілі некалькі прамасленых квачоў, пасталі вакол свежавыкапанай ямы. Патапаў ускочыў у яе і лёг спінаю дагары, яго накрылі збітымі дошкамі і хуценька засыпалі яму ўпоравень з зямлёю. Усе замерлі ад страху: упершыню закапалі жывога чалавека. Нехта сказаў: «Адкопвайце. Ён жа затхнецца». Але пясок у яме заварушыўся, пачаў пучыцца і асыпацца, з ямы пачуўся крэкт, паказаліся тарцы дошак, з-пад іх высунулася галава Патапава, пры святле паходняў бліснула змакрэлая спіна, пясок ссунуўся, адваліўся шчыт. У яме стаяў і змушана ўсміхаўся Патапаў. Яму падалі рукі, і ён, цяжка дыхаючы, вылез з ямы.

На другі дзень Патапаў паўтарыў усе нумары, але ў яму болей не палез. Гледачы абураліся: «Ашукаў! За тыя ж грошы з магілы вылазіў, а нам дулю паказаў». Ім хацелася за свайго паўрубля паглядзець пакуты гэтага дужага чалавека, а ён, відаць, болей не мог, бо і ўчора ледзьве вылез з ямы...

Ніхто не бачыў і не ведаў, калі і куды паехаў Патапаў, а хлапчукі яшчэ доўга гулялі ў асілкаў, як і ён, уцягвалі жываты, напіналі худзенькія грудзі, спрабавалі падкідаць гіры, але часцей збівалі сабе на нагах пальцы. Так гулялі ў асілка да прыезду наступнага гастралёра.

У 1930 годзе я пачаў працаваць на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. Аднаго разу апоўначы, пасля другой змены, у прахадной мне сустрэўся высокі даўгатвары мужчына ў старым кавалерыйскім шынялі, у будзёнаўцы і падсмаленых залатаных валёнках. Твар быў хваравіты і жоўты, вочы гарэлі ліхаманкавым бляскам. Ён павесіў свой нумар на табельную дошку і павольна пайшоў у змрок двара. У ім нешта здалося знаёмае.

– Хто гэта? – спытаў я ў вахцёра.

– О-о-о, брат, гэта не абы-хто. Можа, чуў, быў асілак з асілкаў, Патапаў яму хвамілія. Ніхто яго ніколі не пабораў, ніхто не мог зраўняцца сілаю. Была, ды сплыла. Цяпер ледзьве ходзіць. Ні сям'і, ні здароўя няма, а меў жа такую сілу!

*Паводле Сяргея Грахоўскага*
*1985–1987?*